# Як аб'ядналіся арт-тэрапія і роспіс па шкле

28.10.2023 11:26 | Аўтар: Лізавета Голад | Без рубрики

**Майстар-клас па вырабе дэкаратыўнага пано ў тэхніцы «Роспіс па шкле» прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Па-сапраўднаму расслабляльную атмасферу, напоўненую творчасцю і хатняй утульнасцю стварыла майстар народнай творчасці Ніна Шкурдзюк, яна кіравала творчым працэсам і дапамагала ўдзельнікам майстар-класа.**




Сама тэхніка сыходзіць сваімі каранямі ажно ў эліністычны перыяд. Але на тэрыторыі нашай краіны старажытны народны жывапіс па шкле пачаў набіраць папулярнасць толькі з XVIII стагоддзя. У асноўным тады з'яўляліся творы рэлігійнага зместу. Пасля тэматыка пашыралася. Так, адлюстраваць на шкле можна было і кветкавыя кампазіцыі, і краявіды, і традыцыйныя арнаменты.




Удзельніцы майстар-класа не былі абмежаваныя ў тэматыцы, аднак усе, нібыта змовіўшыся, пісалі на шкле кветкавыя матывы. А яшчэ працэс стварэння пано быў не зусім звычайным: майстар народнай творчасці Ніна Шкурдзюк па сумяшчальніцтве яшчэ і арт-тэрапеўт, таму яна перакананая, што перад тым, як прыступіць да любой карпатлівай працы абавязкова трэба «размалявацца» і што ўвогуле народная творчасць можа быць добрай тэрапіяй. Так, удзельніцы майстар-класа спачатку малявалі акварэллю на тканіне і рабілі эскізы на паперы і толькі пасля гэтага прыступалі непасрэдна да самога роспісу па шкле. Варта адзначыць, што для ўстойлівасці малюнка да гуашы дадавалі клей ПВА. Пасля завяршэння працы пад малюнак прапанавалі падкласці рознакаляровую фальгу (так ён будзе выглядаць значна больш эфектна).




Атмасфера на майстар-класе была неверагодная. Падаецца, што ўсе сталі блізкімі сябрамі за некалькі гадзін сумеснай творчасці. Ды і роспіс па шкле сам па сабе занятак зачаравальны і ўнікальны.




























**Лізавета ГОЛАД**

**Фота аўтара**